

ХАРЧАВАННЕ ПА ЛІЧБАВЫМ ПАШПАРЦЕ 5

ЦІ МОЖНА КІРАВАЦЬ МЫСЛЕННЕМ ЧАЛАВЕКА? 8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЛІСТАПАДА 2022 г. СУБОТА № 233 (29855)

## КОРАТКА

• **На рэках Беларусі адзначаецца спад узроўняў вады.**

• Перасовачныя заводы МКЗ-3214 ТАА «Мабільныя камбікормавыя заводы» атрымалі рухавік беларускай вытворчасці.

• **Мінсельгасхарч і кітайская кампанія абмеркавалі пастаўкі ўпакоўкі малочнай прадукцыі.**

• Мадэрнізаваны цэх па перапрацоўцы лёну адкрылі на заводзе ў Дуброўне.

• **Беларуская чыгунка праводзіць анкетаванне сярод атрымальнікаў і адпраўшчыкаў грузаў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван КУБРАКОЎ, міністр унутраных спраў:**

*«Акрамя call-цэнтраў, якія знаходзяцца ва Украіне, распрацавана цэлая сістэма навучання аператараў. Ёсць спецыяльныя вучэбныя цэнтры, якія таксама знаходзяцца ва Украіне. Тэлефонных аператараў навучаюць і тлумачаць, як размаўляць, даюць пэўныя матэрыялы і набор слоў, як у той ці іншай сітуацыі даводзіць штосьці да грамадзян Беларусі. Найбольш уразлівыя тут людзі сталага ўзросту. Праз СМІ мы даводзім гэтую інфармацыю, прыводзім канкрэтныя прыклады, але маштабы падману вельмі і вельмі велізарныя. Толькі сёлета ўрон, нанесены ад гэтай катэгорыі махлярстваў, склаў $4,5 млн. Такой колькасцю грошай на тэрыторыі Беларусі завалодалі ашуканцы, якія знаходзяцца ва Украіне. Мы даводзім лічбы, расказваем нашым людзям. На жаль, часам грамадзяне не чуюць гэтага».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ПАТРЭБНЫ КАНКРЭТНЫ ПЛАН І АДКАЗНЫЯ ЛЮДЗІ. КАЛІ ГЭТАГА НЕ БУДЗЕ — МАРНАЯ РАЗМОВА І БЕСПРАСВЕТНАЯ БУДУЧЫНЯ»



Фота БелТА.

**Развіццё аграпрамысловага комплексу Гомельскай вобласці, яго праблемы і перспектывы абмеркавалі на нарадзе ў аблвыканкаме з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Дадзены рэгіён знаходзіцца на асаблівым кантролі кіраўніка дзяржавы. Менавіта Гомельшчына найбольш пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Для ліквідацыі наступстваў дзяржава дзесяцігоддзямі ўкладала вялікія сродкі. Але, тым не менш, Гомельшчына паказвае самыя нізкія вынікі работы аграпрамысловага комплексу. На гэта ёсць аб'ектыўныя (кліматычныя) прычыны, але справа не толькі ў іх.**

«Хачу адразу папярэдзіць: размова мае быць сур'ёзная. Таму ўспрымайце яе, нават жанчыны, па-мужчынску і без крыўдаў», — адразу задаў тон нарады кіраўнік дзяржавы. «Кожны з вас пасля гэтай сустрэчы павінен вярнуцца ў свой раён ці гаспадарку, каб працаваць шмат і напружана. З поўнай самааддачай. І патрабаваць таго ж ад падначаленых. Па-іншаму пераламаць негатыўныя тэндэнцыі ў рабоце рэгіёна не атрымаецца», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што на нядаўнім саміце АДКБ у Ерэване, дзе абмяркоўваліся ваенна-палітычныя пытанні, праблемам харчавання і харчовай бяспекі таксама ўдзялілі шмат увагі. Усе кіраўнікі дзяржаў казалі менавіта пра тое. «Гэта сведчыць аб тым, што ў свеце вельмі сур'ёзная напружанасць з харчаваннем. І ўсё гэта будзе нарастаць», — адзначыў беларускі лідар.

### ШТО НА КЛІМАТ НАРАКАЦЬ...

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу: сёлета ўся краіна працавала на ўраджай, і атрымаўся дастойны вынік. «Які ўклад Гомельшчыны ў агульны каравай? На жаль, ганарыцца няма чым. Мільённы рубеж пераадолелі толькі з кукурузай. А што па мясе, малаку? Уся краіна рухаецца наперад, а вы — уніз!» — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання дакладвае: калі б Гомельская вобласць дасягнула хоць бы ўзроўню мінулага года (нават без росту), краіна ў сельскай гаспадарцы выканала б пастаўленую задачу (рост да 104 працэнтаў). Ён падкрэсліў, што з-за такога падыходу Гомельскага аграпрама ўпушчаная выгада склала каля 100 мільёнаў рублёў. Грошы немалыя. Асабліва сумна, заўважыў Прэзідэнт, што падобная сітуацыя ў рэгіёне не толькі сёлета. ***«Усе вашы адгаворкі ведаю загадзя: надвор'е (то засуха, то дажджы), бальнасць зямлі нізкая (пяскі і вецер), то яшчэ якая зараза. Хачу сказаць: не толькі вы наракаеце на гэтыя акалічнасці. Усюды наракаюць. Але не ўсюды такі вынік, дакладней, яго адсутнасць, як у Гомельскай вобласці.*** Я зямны чалавек і разумею, што ёсць аб'ектыўныя, незалежныя ад нас фактары. Так, аб'ектыўныя фактары ёсць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Але ў той жа час Прэзідэнт задаў лагічныя пытанні. Ці ўлічваюць на Гомельшчыне мясцовыя асаблівасці складу глебы, ці ўмеюць падладжвацца пад кліматычныя ўмовы? Па яго словах, гэтыя кліматычныя ўмовы не нечакана зваліліся на галаву. Таксама кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, наколькі аператыўна прымаюцца рашэнні па пераходзе да аптымальнай структуры пасяўных плошчаў, а таксама што думаюць навукоўцы аб сельскагаспадарчых рэзервах вобласці.

### «ДАЛЕЙ ТАК ЖЫЦЬ НЕЛЬГА, І МЫ НЕ БУДЗЕМ ТАК ЖЫЦЬ»

«Я хачу вас па-сяброўску папярэдзіць. Надыходзячы 2023 год для вас — лакмусавая паперка: ці вы зможаце нешта зрабіць, ці мне давядзецца думаць, што рабіць з Гомельскай вобласцю. Далей так жыць нельга, і мы не будзем так жыць, гэта дакладна. У мяне ёсць, вядома, варыянты: што зарабілі, тое і атрымалі. Мы будзем вас да гэтага падводзіць. ***Я не магу браць з іншых галін грашовыя рэсурсы і перакідваць у Гомельскую вобласць. Думайце, як вы будзеце жыць, зарабляць для таго, каб дастойна выглядаць»***, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама пацікавіўся, як ідуць справы з тым, на што ўплывае чалавечы фактар: захаванне тэхналогій, уніясенне ўгнаенняў, структуры пасеваў, недапушчэнне падзяжу жывёлы, рознага роду хлусні, якая мяжуе з крыміналам, падрыхтоўка і захаванасць сельгастэхнікі. ***«Перш чым марыць аб вялікім, трэба ўзяць тое, што на паверхні. А гэта звязана з чалавечым фактарам. Нават у элементарным — у працоўнай і выканальніцкай дысцыпліне, прытрымліванні літары закона»***, — заявіў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што спецыяльна запрасіў прадстаўніка Генеральнай пракуратуры, каб наглядна і на прыкладах паказаць, як у Гомельскай вобласці працуюць кіраўнікі і што ім замінае. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што практычна ва ўсіх правераных гаспадарках выяўляюцца парушэнні пры вырошчванні жывёлы. У кожнай чацвёртай устаноўлены факты прадстаўлення недакладнай інфармацыі аб яе падзяжы. Трацяна арганізацый дапускае парушэнні тэхналогіі закладкі кармоў, а потым з-за гэтага скаціна гіне. «На месцах бедлам! Хранічныя прыпіскі і крадзеж!» — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў: ён сам практык і ведае, што такое статыстыка і справаздачнасць. «Любая ваша справаздачнасць, статыстычная справаздачнасць — найважнейшы элемент у кіраванні дзяржавай. Але я не разумею, навошта вы хлусіце. Каму патрэбна тая хлусня, лёгка праверыць», — заўважыў ён.

СТАР. 2

Беражыце сябе!

# ХРУСТАЛЬНЫ ГОРАД

**Дробны ледзяны дождж цягам двух дзён глазуруе вуліцы абласнога цэнтра. Барацьба невялікага тэмпературнага мінуса і адлігі ператварыла гарадскія дарогі ў суцэльны каток. Праезджую частку камунальныя службы пачысцілі добра, а вось са слізгатой пешаходных шляхоў вялікага горада пакуль не спраўляюцца. Галалёдзіца значна дадала работы і гомельскім медыкам. Другі дзень асабліва напружанае дзяжурства нясуць спецыялісты траўматалагічнага пункта Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.**

— З улікам умоў надвор'я, якое склалася цяпер у горадзе, колькасць пацыентаў з галалёднымі траўмамі павялічылася як мінімум у паўтара раза. Калі яшчэ некалькі дзён таму за змену прымалі да 40 пацыентаў з траўмамі, то гэтымі днямі не менш за 100, — паведамляе ўрач траўматолаг-артапед па аказанні хуткай меддапамогі Андрэй МАЛАШАНКА.

Звяртаюцца па дапамогу пасля падзення не толькі састарэлыя, але і маладыя, і людзі сярэдняга ўзросту. На калідоры ў чаканні прыёму доктара адны жанчыны, але гэта не значыць, што мужчыны гэтымі днямі абышліся без траўмаў.

Медыкі заўважаюць, што моцны пол проста менш удзяляе ўвагі наступствам падзення. Як зразумець, што неабходна звярнуцца да медыкаў?

— Ацаніце свой фізічны стан здароўя, наяўнасць болевага сіндрому. Калі вас нешта насцярожвае, то варта неадкладна звярнуцца па меддапамогу ў траўматалагічны пункт самастойна ці выклікаць «хуткую», — звяртае ўвагу Андрэй Малашанка.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

22233 9 771990 763008

Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

